# У Дзяржаўнай бібліятэцы імя В. І. Леніна

Беларуская Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна, арганізавала выстаўку, прысвечаную памяці Уладзіміра Ільіча. Выстаўка мае некалькі раздзелаў. У першым раздзеле выстаўлены дванццаць два тамы Твораў В. І. Леніна чацвертага выдання і рад іншых кніг.

На выстаўцы пачэснае месца займаюць творы В. І. Леніна, выдадзеныя на беларускай мове. Тут прадстаўлены кнігі: «Што рабіць?», «Дзве тактыкі соцыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэвалюцыі», «Крок наперад, два крокі назад», «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супроць соцыял-дэмакратаў?», «Аб узброеным паўстанні ў 1917 годзе», «Красавіцкія тэзісы», «Чарговыя задачы совецкай улады», «Дзяржава і рэволюцыя» і іншыя.

У раздзеле літаратуры аб Леніне маюцца кнігі: І. В. Сталін — «Пытанні ленінізма», «Аб Леніне», Ем. Яраслаўскі — «Біяграфія В. І. Леніна», А. Вышынскі— «Вучэнне Леніна — Сталіна аб пролетарскай рэволюцыі і дзяржаве», М. Міцін— «Ваенныя запаветы Леніна», а таксама ўспаміны Д. І. і М. І. Ульянавых аб Леніне і шмат іншых кніг і артыкулаў.

На выстаўцы шырока прадстаўлена мастацкая літаратура аб Леніне. Аднначасова ў бібліятэцы аформлена фотавітрына, ілюстраваная дакументамі і фотаздымкамі з жыцця і дзейнасці Ільіча.